# Час рупіцца і працаваць

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

«У свой час мной было прынята рашэнне аб мадэрнізацыі дрэваапрацоўчых прадпрыемстваў, — нагадаў Прэзідэнт. — Гэта пацягнула за сабой і мадэрнізацыю мэблевых прадпрыемстваў». Аляксандр Лукашэнка прывёў словы віцэ-прэм'ера Уладзіміра Сямашкі, які займаўся ва ўрадзе мадэрнізацыяй: калі б тады не было прынята рашэнне аб мадэрнізацыі нашых дрэваапрацоўчых прадпрыемстваў, яны сёння не існавалі б — ні адно прадпрыемства. Яны б памерлі на рынку, ніхто б не набываў прадукцыю. «Дзякуй богу, што ў свой час схамянуліся, прынялі рашэнне па мадэрнізацыі, сыходзячы з таго, што ў нашай краіне ёсць сыравіна», — адзначыў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы падчас наведвання «Рэчыцадрэва» падкрэсліў чарговы раз: забяспечыць людзям сярэднюю зарплату па краіне ў 1000 рублёў — стратэгічная задача для ўлады.

«Я настойваю на гэтым не таму, што нейкі страх перад людзьмі, што недзе ў вас тут у Рэчыцы 15 чалавек выйшлі на плошчу, — сказаў Прэзідэнт. — Не ў гэтым справа. 1000 рублёў — гэта той мінімум, які мы павінны дапамагчы людзям зарабіць. А далей — варушыцеся самі ў сваіх калектывах. Мы будзем, натуральна, падштурхоўваць — і кіраўнікоў, і ўрад. Але гэты бар'ер, які ў нас некалі быў, трэба аднавіць — 500 з лішнім долараў мы ўжо мелі зарплату».

Кіраўнік краіны звярнуў увагу, што ў Рэчыцы невялікая колькасць непрацаўладкаваных людзей, але тым не менш і для іх важна знайсці і прапанаваць работу.

«Арганізуйцеся, у вас нядрэнны калектыў. Час няпросты, але мы ўжо бачым святло ў канцы тунеля, асабліва ў вас, на вашым прадпрыемстве», — звярнуўся кіраўнік дзяржавы да супрацоўнікаў «Рэчыцадрэва».

* * *

Супрацоўнікі прадпрыемства мелі магчымасць спытаць у кіраўніка дзяржавы пра тое, што іх хвалюе. Як заўсёды, Прэзідэнт даў вычарпальныя адказы.



Фота БЕЛТА.

Кіраўнік дзяржавы падчас наведвання «Рэчыцадрэва».

### Пра развіццё і добраўпарадкаванне гарадоў

Азнаёміўшыся з Рэчыцкім раёнам з верталёта, а таксама праехаўшы па горадзе, Прэзідэнт застаўся задаволены ўбачаным, паколькі ўсюды адчуваўся гаспадарлівы падыход. «У Рэчыцы парадак, малайцы», — пахваліў кіраўнік дзяржавы. Пры гэтым ён пажартаваў, што трэба праехаць па ўсіх райцэнтрах, тады хутчэй усюды навядуць парадак.

Закрануўшы тэму добраўпарадкавання і асабістай адказнасці кожнага за тое, што адбываецца ў яго родным населеным пункце, Аляксандр Лукашэнка выказаў меркаванне, што кожны па магчымасці можа ўнесці ўклад у тое, каб яго малая радзіма была дагледжанай і прыгожай.

Адказваючы на пытанні працаўнікоў калектыву, кіраўнік дзяржавы пазітыўна ацаніў перамены, што адбыліся тут, і выказаў упэўненасць у добрых перспектывах развіцця прадпрыемства.

### Пра развіццё бізнесу

«Мы ствараем умовы для людзей. Гэта дало вельмі моцны штуршок не толькі ў раённых цэнтрах, нават у аграгарадках і пасёлках. Зараз самім людзям трэба варушыцца. У найбліжэйшы час мы прымем рэвалюцыйныя рашэнні па прадпрымальніцтве, па бізнесе. Ты прыйшоў, заяву пакінуў, што хочаш займацца гэтай справай, у падатковай інспекцыі зарэгістраваўся — і пайшоў працаваць. Пажарнікі, санстанцыя — усё будзе скарочана да мінімуму. Рашэнне прынята, у найбліжэйшы час нарматыўна-прававы акт ляжа на стол да Прэзідэнта, і мы цалкам разняволім гэтую ініцыятыву».

Галоўнае — гэта жыццё і бяспека людзей. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў: кіраўнікам будуць дадзены ўсе неабходныя правы і паўнамоцтвы, у той жа час і поўную адказнасць будуць несці менавіта яны.

### Пра падзеі ў Сірыі

Цікавіліся прадстаўнікі калектыву «Рэчыцадрэў» і нядаўнімі сусветнымі падзеямі, бамбардзіроўкай Сірыі, параўноўваючы знешнепалітычную сітуацыю з халоднай вайной.

«Калі я пра гэта даведаўся і пачуў, я проста вельмі шкадаваў, вельмі. Я больш глыбока гляджу на гэтыя праблемы. Але вырашаць унутрыпалітычныя пытанні за кошт знешняй такой агрэсіўнай палітыкі — гэта не той шлях. Сёння ўжо нават Амерыка ў адзіночку, і нават са сваімі найбліжэйшымі натаўскімі саюзнікамі свет не можа перавярнуць або кіраваць нават усім светам. Трэба абмяжоўваць свае апетыты і займацца тым, дзе твае інтарэсы. А яны — у Паўночнай Амерыцы перш за ўсё», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка.

На погляд беларускага лідара, Трампа падвяла эліта ЗША. «У іх не такая прэзідэнцкая ўлада, як, дапусцім, у Беларусі. Склалася сітуацыя, што яму трэба даказваць, што ён нешта можа, што можа кіраваць краінай. А там не даюць. Некаторыя прэзідэнты, каб вырашыць унутрыпалітычныя пытанні, спадабацца людзям, цісНуць на кнопкі».

Кіраўнік дзяржавы ўпэўнены, што перш чым рабіць такія сур'ёзныя дзеянні, неабходна грунтоўна разабрацца ў сітуацыі. У прыклад Прэзідэнт прывёў знешнюю палітыку Кітая. Гэта магутная дзяржава, якая мае сучаснае ўзбраенне, не ўвязваецца ў міжнародныя канфлікты, — краіна працуе над развіццём сваёй эканомікі і сёння з'яўляецца сусветным лідарам па многіх пазіцыях.

Што датычыцца процістаяння Расіі і Амерыкі, Аляксандр Лукашэнка лічыць, што гэтыя дзве ядзерныя імперыі не дойдуць да адкрытага сутыкнення. «Я так думаю, ідзе інфармацыйная вайна. Адзін аднаго пужае, і нас імкнуцца запужаць. Ні Расія, ні Амерыка на «чырвоную кнопку» не націснуць, бо гэта будзе знішчэнне Амерыкі і Расіі, — столькі назапашана ядзернай зброі. А дзе гарантыя, што ў гэтую бойню не ўвяжуцца Вялікабрытанія, Францыя, Кітай, Індыя, Ізраіль, Пакістан, у якіх ёсць ядзерная зброя? Не думаю, што ўжо дойдзе да таго, што нехта возьмецца за ядзерную кнопку, але свет падышоў да вельмі небяспечнай рысы. Ніколі яшчэ гэтага не было»...

### Пра адмену віз

Было пытанне і пра тое, ці разлічвае Беларусь на аналагічныя крокі з боку іншых краін на пяцідзённы бязвізавы рэжым. Прэзідэнт паведаміў, што гэта задача МЗС — пастаянна весці адпаведныя перамовы. У той жа час, Аляксандр Лукашэнка прызнаўся, што больш зацікаўлены ў тым, каб замежнікі прыязджалі да нас, прывозілі свае грошы, знаёміліся з Беларуссю.

**Надзея ЮШКЕВІЧ,**
*yushkevich@zviazda.by*

## ■ Парламенцкі дзённік

## УЗАЕМНАЯ ЗАЦІКАЎЛЕНАСЦЬ

**Працягваецца візіт беларускай парламенцкай дэлегацыі на чале са спікерам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Уладзімірам АНДРЭЙЧАНКАМ у Ісламскую Рэспубліку Пакістан.**

Учора адбыліся афіцыйныя перамовы Уладзіміра Андрэйчанкі з прэм'ер-міністрам Пакістана Навазам Шарыфам і прэзідэнтам Мамнунам Хусейнам па актуальных пытаннях двухбаковага супрацоўніцтва, паведаміла прэс-служба ніжняй палаты.

Таксама Уладзімір Андрэйчанка сустрэўся з міністрам планавання, развіцця і рэформаў Пакістана Ахсанам Ікбалам. Абодва бакі пацвердзілі зацікаўленасць у рэалізацыі сумесных праектаў у сферах прамысловасці, жыллёвага будаўніцтва, развіцця чалавечага патэнцыялу і сельскай гаспадаркі.

У гэты ж дзень беларуская делегацыя прыняла ўдзел у першым беларуска-пакістанскім сельскагаспадарчым форуме.

У рамках форуму адбылося падпісанне Мемарандума аб узаемаразуменні і супрацоўніцтве паміж Беларускім дзяржаўным аграрным тэхнічным універсітэтам і Аграрным універсітэтам Фэйсалабада, а таксама паміж прадпрыемствам «Гомсельмаш» і банкам «Зараі Таракіаці Лімітэд».

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.** *lukashevich@zviazda.by*

## ДАБАВІЦЬ ЯШЧЭ МІЛЬЯРД

**Учора ў ніжняй палаце беларускага парламента прымалі польскую дэлегацыю. Баляслаў ПІРШТУК, намеснік старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі, падчас візіту польска-беларускай парламенцкай групы на чале з яе старшынёй, дэпутатам Сейма Рэспублікі Польшча Адамам АНДРУШКЕВІЧАМ, заявіў аб тым, што да двух мільярдаў долараў мінулагодняга тавараабароту можна дадаць яшчэ адзін.**

«У цэлым 2016-ы быў вельмі прадуктыўны, — адзначыў Баляслаў Пірштук. — Па выніках мінулага года, на мой погляд, мы няблага спрацавалі ў эканамічнай сферы. Наш узаемны тавараабарот наблізіўся да двух мільярдаў долараў. Гэта, вядома, добрая лічба. Але наш патэнцыял як з польскага, так і з беларускага боку значна вышэйшы».

Баляслаў Пірштук выказаў задавальненне стварэннем сумесных вытворчасцяў. На тэрыторыі Беларусі з удзелам польскага капіталу іх больш за 350, на польскай тэрыторыі беларускіх дзейнічае 18. «Гэта сведчыць пра нашы рэзервы. Але сальда пакуль не на нашу карысць», — сказаў парламентарый. На яго думку, беларускаму боку трэба больш актыўна працаваць, каб выраўняць гэты баланс, бо «гандлёва-эканамічныя адносіны добрыя, калі ёсць узаемная выгада».

У сваю чаргу Адам Андрушкевіч выказаў задавальненне тымі адносінамі, што склаліся паміж нашымі краінамі, і адзначыў тое, што яны хутка развіваюцца. Польскі парламентарый агучыў спадзяванне на візавыя паслабленні, нагадаў час, калі віз не было, калі супрацоўніцтва развівалася яшчэ больш актыўна. Бязвізавы 5-дзённы рэжым таксама станоўча адбіўся на адносінах нашых краін, падкрэсліў парламентарый.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*


белагропромбанк
традиции будущего

**Открытое акционерное общество «Белагропромбанк» сообщает, что в соответствии с решением Наблюдательного совета ОАО «Белагропромбанк», на основании предложения Правления ОАО «Белагропромбанк» 19 апреля 2017 года проводится внеочередное Общее собрание акционеров в заочной форме.**

**Место нахождения общества, место и время проведения собрания: 220036, г. Минск, проспект Жукова, 3, 15.00.**

**ПОВЕСТКА ДНЯ**

Об утверждении изменений и дополнений в Устав ОАО «Белагропромбанк».

Список лиц, имеющих право на участие во внеочередном Общем собрании акционеров, составляется на основании реестра владельцев ценных бумаг по состоянию на 10 апреля 2017 года.

С материалами по вопросам повестки дня лица, имеющие право на участие в Общем собрании акционеров, могут ознакомиться по месту нахождения Правления ОАО «Белагропромбанк» (г. Минск, проспект Жукова, 3) с 11 апреля по 17 апреля 2017 г. ежедневно, кроме выходных и праздничных дней, с 8.30 до 12.30.

Для получения бюллетеней для заочного голосования просим обращаться в ОАО «Белагропромбанк», его филиалы по месту нахождения акционеров, а также иметь при себе документ, удостоверяющий личность (для представителей акционеров – дополнительно документ, подтверждающий полномочия).

Заполненные бюллетени для заочного голосования представляются не позднее 17 апреля 2017 года по адресу: 220036, г.Минск, пр-т Жукова, 3, депозитарий ценных бумаг ОАО «Белагропромбанк» почтовой связью, нарочным по месту нахождения Правления банка и филиалов по месту нахождения лиц, имеющих право на участие в Общем собрании акционеров, средствами факсимильной связи по телефону/факсу: 229 64 10 или 229 64 51 с обязательной последующей доставкой (досылкой) оригинала бюллетеня.

Принявшими участие в Общем собрании акционеров считаются лица, заполненные бюллетени которых получены ОАО «Белагропромбанк» в установленном порядке.

Телефон для справок: 8(017) 229 64 10.

ПОЗВОНИ В СВОЙ БАНК 136

www.belapb.by

Лицензия на осуществление банковской деятельности №2 13.01.2017 выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100693551.


## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### Мэр Фрайберга выставіў Ангеле Меркель рахункі за размяшчэнне бежанцаў



Універсітэцкі горад Фрайберг (федэральная зямля Саксонія) на ўсходзе Германіі прыняў каля 1700 бежанцаў, утрыманне якіх летась абышлося мясцовым уладам у € 736 тысяч. Обер-бургамістр (мэр) горада Свен Кругер выставіў рахунак за прыём мігрантаў асабіста канцлеру Ангеле Меркель. Пра гэта паведаміла газета Die Welt.

На гарадскім сайце змешчана інфармацыя, што Фрайберг «адкрыты свету», што «многія гараджане аказваюць бежанцам самую розную дапамогу — ад ахвяраванняў рэчаў да шэфства ў пытанні навучання мове». Гэтая колькасць людзей — 1,7 тысячы саіскальнікаў прытулку — амаль 4% ад насельніцтва горада. Цяпер Кругер хоча атрымаць назад усе сродкі, затрачаныя з гарадской казны ў 2016 годзе на бежанцаў. Ён накіраваў рахунак напрамую на адрас ведамства федэральнага канцлера: асабіста канцлеру Ангеле Меркель, на вуліцу імя Вілі Бранта, 1, 10577, Берлін.

### Тылерсан ляціць у Маскву на фоне спадзяванняў на нармалізацыю сувязяў, якія пахіснуліся

У цэнтральны пункт парадку дня маючых адбыцца перамоў новая адміністрацыя ЗША ператварыла сірыйскі крызіс, вылучыўшы пры гэтым патрабаванні да Масквы, якія з'яўляюцца заведама непрымальнымі. У сувязі з гэтым двухбаковыя адносіны фактычна завязаны на дыскусіі па Сірыі, а разбор завалаў назапашаных за апошнія гады праблем, які востра патрабуецца, можа апынуцца пад пагрозай.

Гэтак жа стала вядома, што дзяржсакратар Тылерсан абмяркуе ў Маскве, на якім этапе знаходзіцца зараз падрыхтоўка расійска-амерыканскай сустрэчы на вышэйшым узроўні.

На думку амерыканскай прэсы, «погляд дзяржсакратара Тылерсана заключаецца ў тым, што перш нам трэба падрыхтаваць глебу, убачыць, ці мае сэнс такая сустрэча» прэзідэнтаў Пуціна і Трампа «ў кантэксце двухбаковых адносін». Думаецца, у гэтым будзе заключацца падыход, які Тылерсан стане выкарыстоўваць, пішуць выданні.

### У Аўстраліі заолагі вылечылі ад нарказалежнасці пітона, які жыў у прытоне

Двухметровы пітон, якога канфіскавалі супрацоўнікі паліцыі падчас рэйду ў лабараторыі па вытворчасці метамфетаміну, настолькі прыахвоціўся да наркотыкаў, што яго прыйшлося змясціць у спецыяльную рэабілітацыйную турму для... жывёл, паведамляе The Daily Telegraph.

Гіганцкая змяя прыцягнула ўвагу праваахоўнікаў сваімі агрэсіўнымі паводзінамі ў ходзе спецаперацыі. Як устанавілі пасля заолагі, рэптылія, знаходзячыся ў замкнёнай прасторы лабараторыі, падверглася ўздзеянню часціц метамфетаміну і фактычна стала залежнай ад наркотыку.

Як і ў выпадку лячэння нарказалежных людзей, змяю змясцілі ў спецыяльным рэабілітацыйным цэнтры для прадстаўнікоў дзікай прыроды ў Віндзары. На думку спецыялістаў цэнтра, якія прымалі змяю, нарказалежнасць пітона была бачная няўзброеным вокам. Спецыялістам рэабілітацыйнага цэнтра спатрэбілася каля месяца, каб вывесці наркотык з арганізма змеі, і толькі праз сем месяцаў рэптылія вярнулася да стану нармальнага жыцця.